# НАЙЛЕПШЫ ЧАС — ЦЯПЕР



*Амаль у кожнай вёсцы ёсць свой дзівак. Валерый з іх ліку. Гэтаму надзвычай энергічнаму мужчыну — 68 гадоў. Больш за ўсё на свеце ён любіць гісторыю і пра нашы замкі, цэрквы ды касцёлы, здаецца, можа расказваць бясконца. У сезон вандруе па Беларусі на ровары, намотваючы сотні кіламетраў за дзень. Ужо на пенсіі, ён задумаў пабудаваць сабе дом з каменю, які яго суседзі называюць мясцовай славутасцю, вясковым замкам. Каб узвесці яго, Валерый тры гады, як ён сам кажа, ачышчаў калгасныя палі ад камянёў. Вазіў іх на тачанцы, якую прывязваў да свайго жалезнага двухколавага каня. Будаваў «сваю крэпасць», у якой нават печка выкладзена з каменю, практычна адзін. У 2025 годзе плануе заехаць туды жыць. Хтосьці скажа: вунь што задумаў — у 68 гадоў будаваць дом, ды яшчэ з каменю, сапраўды, дзівак. А я шчыра захапляюся такім дзівацтвам і смеласцю крочыць да сваёй мары, не азіраючыся на ўзрост і на тое, хто і што падумае.*

*Мы ездзілі на экскурсію да Валерыя ўсёй сям'ёй. Пасля паездкі муж даслаў мне ролік пра кітайца Ван Дэшуня. У 44 гады ён толькі пачаў вывучаць англійскую мову, у 49 стварыў сваю групу пантамімы, у 50 упершыню пайшоў у фітнес-залу, у 57 запусціў перформанс «жывая скульптура», у 65 навучыўся ездзіць вярхом на кані, у 78 — кіраваць матацыклам, у 79 выйшаў на подыум, у 81 стаў пaслом вядомай кампаніі па вытворчасці спартыўнага адзення і абутку. А ў 85 атрымаў ліцэнзію пілота, тым самым рэалізаваўшы яшчэ адну сваю даўнюю мару. Цяпер Ван Дэшуню 87. І ён ужо паставіў перад сабой чарговую мэту — скокнуць з парашутам. Бо лічыць, што нельга адкладваць важнае на нявызначанае потым. Ёсць рэчы, якія трэба паспець, бо без іх наша жыццё будзе няпоўным. І найлепшы для гэтага час — цяпер, бо хто ведае, што будзе заўтра. На пытанне, як яму ўдалося захаваць такі юнацкі запал, мужчына адказаў: «Прырода вызначае ўзрост, але менавіта вы вызначаеце свой душэўны стан. Вакол столькі магчымасцяў! Калі вы, гледзячы на лічбы ў пашпарце, кажаце, што ўжо вельмі позна, падумайце, можа, гэта толькі апраўданне, каб здацца. Ніхто не здольны спыніць чалавека на шляху да сваёй мары, акрамя яго самога».*

*«Бог разлічвае, якой даўжыні будзе тваё жыццё, — сказаў у адным са сваіх інтэрв'ю акцёр Аляксандр Абдулаў. — А вось якой шырыні — гэта залежыць ад цябе».*

*Ведаю некалькі жанчын-беларусак, якія прыйшлі ў мадэльную школу пасля выхаду на пенсію. Святлана адна з іх. У свае 61 яна ходзіць па подыуме, здымаецца ў кліпах і рэкламных роліках, выкладае дэфіле. Падчас сваіх заняткаў яна можа і па сем гадзін хадзіць на абцасах.*

*Калі я чарговы раз пачынаю скардзіцца на стомленасць і страту цікавасці да жыцця, каб не захрасаць надоўга ў гэтым стане, натхняюся падобнымі пазітыўнымі гісторыямі. А нядаўна адкрыла для сябе цудоўны фільм італьянскага рэжысёра Паола Сарэнціна «Вялікая прыгажосць». Галоўны герой, пісьменнік і журналіст Джэп Гамбардэла, кажа, што толькі праз некалькі дзён пасля таго, як яму спаўнілася 65, зразумеў адну важную рэч: «Я не магу больш страчваць час, робячы тое, што не хачу рабіць». І нарэшце дазволіў сабе гэта.*

*А што датычыцца меркавання іншых... Пра гэта ёсць цудоўная прытча. Бацька з сынам селі на асла і паехалі па найбліжэйшых вёсках. У першай іх аблаялі за тое, што яны ўдвух едуць на жывёліне, не шкадуючы яе. Тата злез з асла. Але ў другой вёсцы насварыліся на сына за тое, што той не шануе бацьку, які вымушаны ісці пешкі. Далей на асла сеў толькі тата, і што вы думаеце? У трэцяй вёсцы ўжо аблаялі яго — за бяздушнасць у адносінах да юнага сына. Пасля гэтага яны высеклі ў лесе жэрдку, звязалі асла і панеслі яго на сабе. У чарговай вёсцы іх дакаралі за ссечанае дрэва і глупства — бо асла ж можна было і дома пакінуць. Пасля яны ўзялі асла на аброць, але іх абазвалі дурнямі, бо асёл ідзе марна і без справы. У выніку тата сказаў сыну: «Запомні, так будзе заўсёды, калі ты не будзеш думаць сваёй галавой. Азіраючыся на меркаванне іншых людзей і жывучы іх розумам, ніколі нікому не дагодзіш. Таму слухай уласнае сэрца і будзь сабой».*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Сямейная газета

Выпуск № 17 (220)

Тыя, хто побач

Мастацкі кіраўнік тэатра імя М. Горкага Сяргей КАВАЛЬЧЫК:

# «Самае каштоўнае ў жыцці даецца бясплатна»

**Ці замінае сумесная праца шлюбу? Якіх прынцыпаў прытрымлівацца ў выхаванні дзяцей? Чаму тэатр працягвае цікавіць гледачоў? Як сёння варта выбіраць рэпертуар? Сваімі думкамі пра гэта і іншае дзеліцца прадаўжальнік вядомай творчай дынастыі, шматдзетны тата, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Сяргей Кавальчык.**



## МЕСЦА СІЛЫ

— Часта чуеш, што сямейныя саюзы творчых людзей нетрывалыя. Не згодны. Мне здаецца, прафесійная прыналежнасць у гэтым не адыгрывае ніякай ролі. Мае бацькі (рэжысёры і педагогі Міхаіл Станіслававіч і Эмілія Міхайлаўна Кавальчыкі. — **Аўт.**) пражылі разам больш як паўстагоддзя, ім ніяк не перашкодзіў іх род заняткаў. І нам з Вікай (актрысай Вікторыяй Кавальчык. — **Аўт.**) агульнае месца працы не замінае ў шлюбе. Пасля рэпетыцый і спектакляў, фізічна знаходзячыся дома, у думках я яшчэ нейкі час звычайна ў тэатры. Жонка часам пытаецца: «Ты калі дадому вернешся?» Тады разумею: час пераключацца. Затое нам заўсёды ёсць пра што пагаварыць адно з адным — і гэта відавочны плюс.

Я перакананы ў тым, што сям'я павінна будавацца на каханні. Калі яго няма, то шлюб, напэўна, акажацца нетрывалым. Але каханне — не данасць, яго не атрымліваюць гатовым, яно залежыць ад дваіх. На мой погляд, моцныя саюзы ўтвараюцца паміж людзьмі, якія прымаюць адно аднаго такімі, якія яны ёсць, з усімі добрымі якасцямі і недахопамі, не імкнучыся перарабіць і перакроіць пад сябе. У кожнай сям'і бываюць цяжкасці, ва ўсіх здараюцца канфлікты. Аднак гэта не нагода расставацца, разбураць шлюб. Калі сужэнцы шануюць адносіны, то пры жаданні заўсёды можна знайсці выйсце, утаймаваць эгаізм, вырашыць супярэчнасці, захаваць стасункі.

У нашай сям'і няма цвёрдага падзелу на мужчынскія і жаночыя абавязкі. Зразумела, я не прыцягваю Віку капаць градкі на дачы. Але з задавальненнем гатую сняданкі, няхай простыя і традыцыйныя: аўсяную кашу, яечню, каву. І малодшы з дзетак, Юра, упэўнена адчувае сябе на кухні. Часам вяртаемся з Вікай увечары пасля спектакля, а дома нас чакае вячэра, прыгатаваная сынам. І мы яму ад душы ўдзячныя. Няма праблемы — каму памыць посуд, прыбраць у кватэры.

Для мяне сям'я — базавая жыццёвая каштоўнасць. Гэта месца сілы. Дзе яшчэ мы можам «выдыхнуць», пагаварыць адкрыта, падзарадзіцца энергіяй, з кім мы гатовы пераадолець любыя цяжкасці? У каго я знаходжу падтрымку, калі нешта не ладзіцца? Перш за ўсё — у жонкі, а яна — у мяне. Разам лягчэй пераадольваць любыя рыфы.

**(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)**

Прыклад для пераймання

# СЕМ КОЛЕРАЎ «ВЯСЁЛКІ»

## Адзін дзень у садку сваёй мары

**На мінулым тыдні я трапіла ў дзіцячы садок, пра які даведалася зусім выпадкова, — ад музычнага кіраўніка з аграгарадка Навaселле, што пад Мінскам, Таццяны Глебік. Пазнаёміліся мы, што сімвалічна, на майстар-класе па беларускіх народных танцах у музеі Якуба Коласа. «А прыязджайце да нас у садок, не пашкадуеце! — запрасіла тады Таццяна. — Мы ўжо шмат гадоў далучаем дзяцей і іх бацькоў да традыцый нашых продкаў. І якраз напрыканцы верасня плануем зладзіць традыцыйнае абрадавае дзеянне «Багач».**



Усе ахвотныя маглі павучыцца ў Хрысціны ЛЯМБОВІЧ ткаць паясы. За гэтай справай я і сфатаграфавала Таццяну КВЕЦЕНЬ з дачушкай Васілісай.

## ПРА СЯВЕНЬКУ ДЫ ПШАНІЧНЫ КАЛАСОК

І вось я ў Навасельскім дзіцячым садку. Увечары па дзетак прыйшлі мамы і таты, але ніхто з іх не спяшаецца дадому. Усе ідуць у музычную залу, дзе ўладкоўваюцца за столікамі — імправізаванымі хатамі.

Да 21 верасня, дня Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, звычайна заканчваліся ўсе работы па зборы збожжа. Менавіта ў гэты дзень восеньскага раўнадзенства вяскоўцы і святкавалі «Багач». Упрыгожвалі апошні сноп і абыходзілі з ім вёску. У кожным двары ім у сявеньку клалі па жменьцы зярнятак. Затым гэтыя дары як сімвал вясковай еднасці пакідалі на покуці ў хаце самага гасціннага гаспадара. Менавіта да ўдзелу ў гэтым абрадзе супрацоўнікі і выхаванцы дзіцячага садка далучылі бацькоў. Дарэчы, пшаніца, якую тыя клалі ў сявеньку, незвычайная. Яе ўласнаручна вырасціў, зжаў сярпом ды абмалаціў цэпам мясцовы жыхар Анатоль Цітавец.

**(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)**